■ Факт

ПЛЮС ДАДАТКОВЫ ПРАЦЭНТ

Найбуйнейшы банк краіны прапануе сваім кліентам з 31 студзеня налічэнне заахвочвальнага працэнтнага даходу па пэўных тэрміновых банкаўскіх укладах (дэпазітах) у беларускіх рублях, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.

Такім чынам, па ўкладзе «Ашчадны» дадатковы працэнт складае 18% гадавых, па дэпазіце «Ваш выбар» (незалежна ад штодзённага астатку ўкладу) — у памеры 17% гадавых, «Прэміяльна-назапашвальны «Дзіцячы» — 17%, «Класік плюс» — 14,7 %, а «Назапашвальны» — у памеры 15% гадавых.

Налічэнне заахвочвальнага працэнтнага даходу ажыццяўляецца сёлета на штодзённыя фактычныя астаткі названых відаў укладаў за перыяд з 31 студзеня або дня адкрыцця ўкладу (дэпазіту) пасля названай даты па 27 лютага (уключна).

Сяргей КУРКАЧ.

ПРЫПЫНЕНА ДЗЕЯННЕ ЛІЦЭНЗІІ ЗАТ «ІНТЭРПЭЙБАНК»

Праўленнем Нацыянальнага банка Беларусі прынята рашэнне аб прыпыненні з 3 лютага 2014 года тэрмінам на 1 год дзеяння ліцэнзіі ЗАТ «ІнтэрПэйБанк» на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці ў частцы ажыццяўлення банкаўскіх аперацый па прыцягненні грашовых сродкаў фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, на рахункі і ва ўклады (дэпазіты), паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.

Рашэнне прынята па выніках комплекснай праверкі ў сувязі з невыкананнем банкам шэрагу патрабаванняў банкаўскага заканадаўства. Гэта не прывядзе да ўзнікнення ў банка абавязацельстваў па датэрміновым вяртанні сродкаў фізічным асобам па раней заключаных дагаворах. Па памеры актываў ІнтэрПэйБанк займае 27-е месца ў банкаўскай сістэме краіны. Доля актываў банка ў банкаўскай сістэме неістотная і на 1 студзеня складала 0,08%, а аб'ём прыцягнутых сродкаў фізічных асоб — 4 млрд рублёў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

СПЯКОТНЫ. СПАРТЫЎНЫ. ЛЮТЫ

7 лютага стартуюць XXII Алімпійскія гульні ў Сочы. Іх адкрыццё змогуць убачыць і беларускія аматары спорту — трансляцыю ўрачыстай цырымоніі пакажа ў прамым эфіры тэлеканал «Беларусь-1».

Адкрыццё зімовай алімпіяды пройдзе на стадыёне «Фішт», разлічаным прыкладна на 40 тысяч гледачоў. Вядома, што доўжыцца цырымонія будзе каля 3 гадзін. У адмысловым шоу, падзеленым на 9 частак, арганізатары паабяцалі задзейнічаць найбольшую колькасць удзельнікаў за ўсю гісторыю Алімпійскіх гульняў. Дакладна пацверджана, што на адкрыцці выступіць гурт «Тату». Імёны ж іншых удзельнікаў, дэталі і падрабязнасці шоу дагэтуль трымаюцца ў сакрэце. Традыцыйна фінальным акордам цырымоніі стане нараджэнне алімпійскага агню.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

АГОНЬ НА БУДПЛЯЦОЎЦЫ Ў МАЛІНАЎЦЫ

У сталіцы ўначы палыхнула на адкрытай пляцоўцы станцыі метро, якая будуецца. Калі на месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, над будматэрыламі вышыня полымя дасягала дзесяці метраў.

Пра здарэнне пасля трох гадзін ночы паведамілі жыльцы суседніх дамоў: на адкрытай тэрыторыі станцыі метро «Малінаўка», якая будуецца па праспекце Дзяржынскага — пажар. Падчас разведкі было ўстаноўлена, што на будоўлі падземнага пераходу загарэўся ўкладзены ўцяпляльнік на плошчы 25 квадратных метраў. Таксама гарэла яшчэ 40 кубічных метраў уцяпляльніка, што быў складзіраваны побач. Пажар ліквідавалі праз 18 хвілін пасля паведамлення пра яго. Прычыны высвятляюцца, але мяркуецца, што адбылося кароткае замыканне электраправодкі сістэмы падагрэву бетону.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

«МЕНАВІТА ПРЫБЫТАК, А НЕ КРЭДЫТЫ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры гэтым прагноз 2014 года не робіць акцэнт на аб'ёмных паказчыках. Практыка мінулых гадоў паказала, што залішняя ўвага да іх можа правакаваць нарастанне макраэканамічных дысбалансаў. А з пункту гледжання лічбаў прагноз кансерватыўны. Будуць станоўчыя тэндэнцыі, змены знешніх умоў — і прагноз стане больш аптымістычным. Сваім указам ад 31 снежня 2013 года Прэзідэнт падтрымаў прагноз па стрыманым эканамічным росце.

— Якія перадумовы існуюць для прагназавання такіх (прапісаных ва ўказе) лічбаў? Ці справіцца з гэтым эканоміка?

— Асноўнай бяспечнай крыніцай эканамічнага росту з'яўляецца экспарт. У прагнозе закладзены тэмп яго росту ў памеры 108,6%. Каб яго дасягнуць, на знешніх рынках неабходна прадаць тавараў на 41 млрд доларaў. Гэта прыкладна ўзровень 2011 года і на 5 млрд менш, чым у 2012-м. А калі аналізаваць апошнія 5 гадоў, то экспарт 2008 года нам трэба перавысіць на 25%, пры тым, што прамысловая вытворчасць, у параўнанні з тагачасным узроўнем, павінна вырасці на 30%. Гэта значыць, эканамічныя магчымасці для стварэння тавараў на патрэбную суму ёсць. І па звестках аб ёмістасці і патрэбе знешніх рынкаў, яны гатовы паглынуць такі аб'ём нашых тавараў.

Кіраўніку могуць выплачваць працэнт ад выручкі, напрыклад, за зніжэнне запасаў, або працэнт ад сумы заключанай знешнеэканамічнай здзелкі.

Іншая важная перадумова — рост рэнтабельнасці. Урад паставіў перад прамысловымі міністэрствамі і канцэрнамі напружаныя, але выканальныя прагнозныя заданні. Каб іх выканаць, неабходны новыя магутнасці, трэба пераглядаць асартымент эфектыўна кіраваць выдаткамі. І гэта ўжо задача менеджменту арганізацый. А задача ўрада — стварэнне ўмоў.

У развіццё ўказа аб прагнозе Мінэканомікі распрацавала (і ўрад прыняў) пастанову Саўміна ад 13 студзеня 2014 года № 17, у якой, у прыватнасці, прадугледжана стварэнне новых арганізацый і вытворчасцяў, у тым ліку за кошт прамых замежных інвестыцый, якія, у сваю чаргу, забяспечаць рост вытворчасці інавацыйнай прадукцыі, прадукцыі з высокім дабаўленым коштам, здольнай канкурыраваць на сусветным рынку. Таму важна разумець значэнне прамых замежных інвестыцый. Па-першае, гэта адна з крыніц пакрыцця дэфіцыту плацежнага балансу. Па-другое, эфектыўнасць ПЗІ з'яўляецца найважнейшым фактарам мадэрнізацыі беларускай эканомікі.

Акрамя таго, важнай перадумовай дасягнення прагназуемых параметраў, асабліва для рэгіёнаў, з'яўляецца далейшае развіццё малога і сярэдняга бізнесу і павелічэнне яго ўнёску ў ВУП.

— Вось толькі як гэтага дасягнуць?

— У дадатак да ўжо наяўных механізмаў падтрымкі (такіх, як Дэкрэт № 6) згаданай пастановай урад прадугледзеў стварэнне гарантыйных фондаў за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў. Гэта сродак забеспячэння доступу да крэдытных рэсурсаў для малога і сярэдняга бізнесу. З гэтых фондаў можа быць прадстаўлена паручальніцтва — да 70% патрэбнага прадпрымальніку закладнога забеспячэння пад крэдыт. Запланаваны захады па ўключэнні ў абарот па прымальных цэнах дзяржмаёмасці, якая не выкарыстоўваецца або выкарыстоўваецца неэфектыўна.

— На бізнес-форуме Усходняга партнёрства ў Вільні вы заяўлялі аб рэформе дзяржаўных прадпрыемстваў. На вашу думку, якім чынам гэтага можна дамагчыся?

— Мэтавая задача — пераход да пакаэцькай планавання і прагназавання якаснага, а не аб'ёмнага развіцця. Таму прадпрыемствам будуць зацверджаны толькі якасныя паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця: рэнтабельнасць продажаў у прамысловасці, экспарт тавараў і паслуг, суадносіны экспарту тавараў і аб'ёму прамысловай вытворчасці.

Найважнейшае пытанне — павышэнне эфектыўнасці кіравання дзяржпрадпрыемствамі. Зрабіць гэта трэба праз павышэнне матывацыі менеджараў, праз прызначэнне ў гаспадарчыя таварыствы прафесійных кіраўнікоў-прадстаўнікоў дзяржавы.

Структурнае рэфармаванне прадпрыемстваў, падпарадкаваных міністэрствам і канцэрнам будзе ўключаць у сябе таксама перадачу іх невытворчых аб'ектаў адпаведным профільным міністэрствам, вывад на аўтсорсінг дапаможных і абслуговых функцый, укараненне сістэм кіравання рэсурсамі і забеспячэнне за кошт гэтага зніжэння выдаткаў і аптымізацыі колькасці персаналу.

— Якім чынам можна змяніць матывацыю менеджараў дзяржкампаній?

— У сучасных умовах самы дзейсны рычаг для гэтага — фінансавая зацікаўленасць менеджара ў павышэнні эфектыўнасці работы арганізацыі. Памер акладу, бонусы, гадавыя бонусы — усё гэта цяпер у распараджэнні органа, які наймае кіраўніка дзяржкампаніі. Адпаведныя пастановы ўрада былі прыняты ў 2013 годзе. Кіраўніку могуць выплачваць працэнт ад выручкі, напрыклад, за зніжэнне запасаў. Або працэнт ад сумы заключанай знешнеэканамічнай здзелкі, калі ён сам прымаў у арганізацыі гэтай здзелкі актыўны ўдзел. Са снежня мінулага года з'явілася магчымасць стымуляваць менеджара дзяржаўнай кампаніі за стварэнне дадатковых высокапрадукцыйных працоўных месцаў. Іншымі словамі, створаны гнуткі і прадуманы механізм фінансавай матывацыі кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў. Гэты механізм закліканы арыентаваць іх на прырост прыбытку. Таму што менавіта прыбытак, а не крэдыты — крыніца для інвестыцый і, адпаведна, — развіцця.

Сітуацыя на сусветным калійным рынку яшчэ не стабілізавалася, хаця Беларусь у цэлым справілася з наступствамі «калійнага разводу».

— Наколькі верагодна выкананне запланаванай прыватызацыі на 2,5 млрд доларaў? Як дзяржава будзе вызначаць, якому інвестару аддаць перавагу падчас прыватызацыі?

— Прыватызацыя — не самамэта. Дзяржаўная палітыка будуецца не на атрыманні кароткатэрміновай выгады ад продажу дзяржмаёмасці, а на перспектывах развіцця прадпрыемства, стварэння экспартаарыентаванай канкурэнтаздольнай вытворчасці, асваення новых рынкаў, выканання пэўных сацыяльных гарантый. З улікам гэтых падыходаў любое беларускае прадпрыемства можа быць прыватызавана. Прымаюцца пэўныя захады па спрашчэнні гэтага працэсу.

Сёння на сайце Дзяржкамаёмасці выкладзены пералік з 600 аб'ектаў, прапанаваных для продажу інвестарам. Для 92 прадпрыемстваў (агульны кошт якіх перавышае 5 млрд доларaў) вызначаны спосабы адчужэння. У гэтым спісе дзярждолі ў кампаніях «МТС», «БАТЭ — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты», «Мазырскі НПЗ», «Кіруючая кампанія холдынга «Гарызонт» і іншыя.

Парадак выбару інвестараў максімальна празрысты і залежыць ад спосабу продажу. Калі гэта аўкцыён — перавага аддаецца інвестару, які прапанаваў найбольш высокую цану, пры продажы па конкурсе — інвестару, які прапанаваў умовы, якія адпавядаюць умовам конкурсу або лепшыя. У асобных выпадках, калі ёсць неабходнасць прыцягнення стратэгічнага інвестара, яго выбар ажыццяўляецца на аснове комплексу крытэрыяў у залежнасці ад профілю і віду дзейнасці прадпрыемства, яго патрэб у інвестыцыях, ад памеру гэтых інвестыцый, неабходнасці выканання асобных сацыяльных абавязацельстваў.

Неабходна асабліва адзначыць, што тым інвестарам, хто працуе адкрыта, выконвае патрабаванні беларускага заканадаўства і ўзятыя на сябе абавязацельствы, дзяржава гарантуе незваротнасць прыватызацыі і стварэнне спрыяльных умоў для работы арганізацый незалежна ад формы ўласнасці.

— Якую перспектыву вы бачыце ў размяшчэнні еўрабондаў?

— Сёлета (гэта будзе прыкладна канец вясны — пачатак восені) урад сапраўды мае намер выйсці на рынак з трэцім выпускам еўрааблігацый на суму каля 800 млн доларaў ЗША. Гэтыя сродкі запланаваны ў бюджэце для рэфінансавання часткі плацяжоў па пагашэнні знешняга дзярждоўгу, якія ў 2014 годзе складуць 2,4 млрд доларaў. Ужо вызначаны арганізатары планаванага выпуску еўрабондаў — гэта расійскія інвестыцыйныя кампаніі «Ашчадбанк КІБ» і «ВТБ Капітал». На якіх біржах еўрааблігацыі будуць размешчаны, вырашыцца пазней.

У апошнія месяцы назіраецца паляпшэнне каціровак беларускіх еўрааблігацый, размешчаных у 2010 і 2011 гадах. Па інфармацыі фінансавага агенцтва Bloomberg, даходнасць па еўрабондах першага выпуску складае цяпер 7,098%, другога выпуску — 8,062%, гэта значыць, ніжэй за іх купонны даход (8,5% і 8,9% адпаведна). Пры размяшчэнні новых еўрааблігацый мы будзем імкнуцца да таго, каб захаваць сённяшнія ўмовы.

— Наколькі верагодна адкрыццё новай праграмы з МВФ? На якім этапе знаходзяцца перамовы?

— У нашай краіны ёсць жаданне падпісання новай праграмы супрацоўніцтва з МВФ. Для гэтага існуюць як непасрэдна фінансавыя прычыны, так і прычыны больш глыбокага, структурнага характару. З пункту гледжання грошай, прыцягненне танных рэсурсаў у краіну для рэфінансавання частак дзяржаўнага доўгу з'яўляецца правільнай стратэгіяй, і гэта станоўча адаб'ецца на эканоміцы, паколькі не прыйдзецца адцягваць частку сродкаў на абслугоўванне доўгу. Калі казаць пра структурную карысць праграмы з Фондам, то тут важнасць заключаецца ў правільна выбудаванай праграме структурных рэформаў на аснове вопыту вядучых сусветных экспертаў. Рэалізацыя праграмы дасць магчымасць вызваліць старыя і сфарміраваць новыя фактары вытворчасці.

Што тычыцца перспектыў гэтай праграмы, то на апошнім пасяджэнні пазіцыя беларускага боку аб магчымасці заключэння новай праграмы з Фондам была агучана. Дырэктары МВФ прывіталі прыняцце плана сумесных дзеянняў урада і Нацбанка і выказалі наступную пазіцыю: падтрымка новай дамоўленасці з Фондам будзе залежаць ад прыхільнасці Рэспублікі Беларусь да правядзення рэформаў у спалучэнні з рашучай макраэканамічнай палітыкай.

— Некаторыя аналітыкі выказваюць меркаванне пра тое, што ў нас вельмі шмат дзяржаўных праграм. Яны перакрыжоўваюцца і ў выніку не даюць належнага эфекту. Зменіцца штонебудзь у бліжэйшы час?

— Так, мы актыўна працуем у кірунку аптымізацыі дзяржаўных праграм і ўдасканалення механізму іх фінансавання. У гэтай працы ўдзельнічае Мінэканомікі сумесна з Міністэрствам фінансаў, Нацыянальным банкам і галіновымі міністэрствамі. Будуць сістэматызаваны крытэрыі аднясення праектаў да дзяржпраграм, сфарміравана сістэма ацэнкі іх эфектыўнасці і на стадыі прыняцця, і на стадыі рэалізацыі. Сёлета запланавана прыняцце плана фінансавання дзяржпраграм, увязанага па аб'ёмах і крыніцах, а таксама сістэмы кантролю за яго выкананнем.

— Ці варта чакаць скарачэнняў у сувязі з мадэрнізацыяй і аптымізацыяй вытворчасці? Ці з'явяцца новыя вытворчасці, куды людзі змогуць пайсці працаваць у выпадку страты працы?

— У адпаведнасці з прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2014 год колькасць занятых у эканоміцы скароціцца на 153 тыс. чалавек, або на 3,4%. Прыкладна напалову гэта абумоўлена ўплывам дэмаграфічнага фактару — скарачэннем колькасці насельніцтва ў працаздольным узросце. У выніку мадэрнізацыі чакаецца вызваленне каля 70 тыс. чалавек.

У нашай краіны ёсць жаданне падпісання новай праграмы супрацоўніцтва з МВФ.

Ва ўмовах структурных перабудоў эканомікі вызваленне працоўнай сілы непазбежна. Гэта патрабуе яе ператоку ў іншыя віды эканамічнай дзейнасці, дзе ёсць вакансіі. А яны ў нас ёсць. На 1 студзеня 2014 года па краіне налічвалася каля 50 тысяч свабодных месцаў і толькі 20 тысяч зарэгістраваных суіскальнікаў.

Але, акрамя гэтага, у адпаведнасці з пастановай урада ад 13 студзеня 2014 г. № 17, у рэгіёнах будуць прыняты вычарпальныя захады: старшыні аблвыканкамаў павінны забяспечыць у 2014 годзе стварэнне ў кожным раёне вытворчых арганізацый з колькасцю работнікаў не менш за 15 чалавек (з разліку адна такая арганізацыя на 10 тыс. жыхароў раёна). Усё гэта дасць магчымасць захаваць сёлетні ўзровень беспрацоўя, — 1,5%, не больш.

— Што ўяўляе сабой рэйтынг Doing Business? Ці неабходна нашай краіне імкнуцца патрапіць у яго?

— Справаздача Сусветнага банка «Вядзенне бізнесу» ўяўляе сабой серыю штогадовых дакладаў, у якіх даследуюцца заканадаўчыя нормы рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці: як тыя, што спрыяюць, так і тыя, што перашкаджаюць развіццю бізнесу. І практыка іх прымянення. Падчас даследавання ацэньваецца не столькі колькасць нормаў і правілаў, колькі іх разумнасць і справядлівасць, а таксама прастата адміністравання гэтых працэсаў самімі бізнесменамі. У дакладзе Сусветнага банка «Вядзенне бізнесу 2014» наша краіна заняла 63-е месца сярод 189 дзяржаў. Пры гэтым Беларусь чацвёрты год запар уваходзіць у тройку лідараў сярод 50 краін свету — пастаянных удзельнікаў даследавання, якія дабіліся найбуйнейшых поспехаў у стварэнні больш спрыяльнага рэгулятыўнага асяроддзя для айчынных прадпрымальнікаў, пачынаючы з 2005 года. З 2010 года экспертамі Сусветнага банка для Рэспублікі Беларусь зафіксавана 13 станоўчых рэформаў, адпаведных метадалогіі даследавання «Вядзенне бізнесу».

Навошта нам трэба ўдзельнічаць у гэтых даследаваннях? Па-першае, для дзяржаўных органаў вынікі даследавання з'яўляюцца важным індыкатарам таго, як бізнес успрымае рэгулятыўнае асяроддзе і якія праводзяцца пераўтварэнні. Па-другое, гэты рэйтынг служыць аўтарытэтнай крыніцай інфармацыі для замежных урадаў і бізнесу, для інвестараў. Акрамя таго, вышэйназваныя справаздачы дазваляюць прааналізаваць вопыт развіцця іншых дзяржаў, ацаніць магчымасць яго ўжывання ў нашых умовах. Цікавыя і рэкамендацыі міжнародных арганізацый. Урад мае намер і далей праводзіць рэформы ва ўсіх сферах прадпрымальніцкай дзейнасці з улікам рэкамендацый Сусветнага банка і станоўчага вопыту замежных краін. У нас зацверджаны план дзеянняў па паляпшэнні ўмоў вядзення бізнесу. Яго рэалізацыя дазволіць забяспечыць рэйтынг Рэспублікі Беларусь у справаздачы Сусветнага банка не ніжэй за трыццатую пазіцыю.

Гутарыў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества ЧСТУП «Цемекс», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 309б:

№ лота	Наименование имущества	Стоимость имущества выставленного на торги, рублей РБ	Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС)	Задаток 5%, рублей (без учета НДС)	Сумма шага аукциона в размере 5%
1	Генератор теплового воздуха «Тепловей Т-100N»	17720640	17720640	886032	886032
2	Генератор теплого воздуха «Тепловей Т-100»	17256960	17256960	862848	862848
3	Установка для разгрузки сыпучих материалов	33236091	33236091	1661045	1661045

Организатор торгов – **управляющий в деле о банкротстве ЧСТУП «Цемекс» Борейко Д.И.**

С имуществом (лотом) можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется до 19.02.2014 г. (включительно), по реквизитам для оплаты задатка: р/с № 3012800000579 – текущий в белорусских рублях в ОАО «Белгазпромбанк» Гомельская областная дирекция, МФО 153001742, УНП 490000841.

Условия продажи – без условий.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 19.02.2014 года по адресу: г. Гомель, ул. Ириинская, д. 20 (холл второго этажа Экономического суда Гомельской области по предварительному согласованию по тел.: 80296542561, 80447678805).**

Дата, время, место проведения открытого аукциона **20.02.2014 года в 10.00, г. Гомель, ул. Ириинская, д. 20 (холл второго этажа Экономического суда Гомельской области).**

По вопросам ознакомления с имуществом (лотом) и участия в аукционе, приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 654-25-61; (8044)767-88-05

В **суд Фрунзенского района г. Минска** поступило заявление о признании безвестно отсутствующей БОНДАРЬ Натальи Георгиевны, 07 января 1968 года рождения, уроженки г. Минска, последнее известное место жительства: г. Минск, ул. Жудро, 21-40.

Просьба к гражданам, располагающим какими-либо сведениями о Бондарь Н.Г., сообщить их суду Фрунзенского района г. Минска в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

Свидетельство о государственной регистрации, печать, штампы ИП Николаев А.А., УНП № 491031335 в связи с утерей **считать недействительными.**

Считать недействительным страховой полис филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Бресте по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН 2РП серия БМ № 0675689. УНП 100706519

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 14 марта 2014 г. проводит открытый аукцион № 02-Сф-14 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).
Предмет аукциона: право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 6 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в г. Минске:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	пер. 2-ой Радиаторный, 17 (Фрунзенский район)	500000000006007195	0,0754	1 124 579 690	169 000 000	8 194 758
2.	Земельный участок № 1 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005469	0,0754	883 064 750	132 000 000	2 168 213
3.	Земельный участок № 22 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005076	0,0736	861 990 290	129 000 000	1 864 388
4.	Земельный участок № 23 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005482	0,0733	858 469 250	129 000 000	2 168 213
5.	Земельный участок № 27 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005372	0,0700	819 824 110	123 000 000	1 864 388
6.	Земельный участок № 32 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005371	0,0638	747 211 290	112 000 000	1 864 388

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного блокированного жилого дома.

Аукцион состоится 14 марта 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) **не позднее 10 марта 2014 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 10 февраля по 10 марта 2014 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за земельный участок. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, **решение Мингорисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.**

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора торгов www.mgcn.by.

ЧПТУП «Пчелаут и М» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ЧПТУП «Пчелаут и М» со снижением цены на 70%

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота, без НДС, руб.	Задаток в размере 5%, без НДС, руб.
1	2	3	4
1	Здание детского сада с инв. № 310/С-22236 общей площадью 1059,0 кв.м, расположенного по адресу: Гомельская область, Гомельский р-н, Долголесский с/с, д. Долголесье, ул. Центральная, 58 а, расположенное на земельном участке площадью 0,6486 га	206911800	10345590

Организатор торгов: **управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

Продавец: **ЧПТУП «Пчелаут и М», 246050, г. Гомель, ул. 2-я Революционная, 8.**

Задаток перечисляется до 20.02.2014 г. (включительно), на р/с № 3012540284017 в ЦКО № 2 дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, г. Гомель, МФО 153001739, УНП 490556767.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% (10345590 рублей) от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до **16.00 20.02.2014 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

Дата, время, место проведения открытого аукциона: **21.02.2014 года в 10.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: 8-044-767-88-05, тел.факс 8-0232-68-25-50.

Дополнительная информация содержится на сайте www.disponent.by

Управляющий по делу о банкротстве СООО «Эригал» Монтик Д.Н. – организатор торгов, СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ по продаже имущества СООО «Эригал»:

№ лота	Наименование лота, его местонахождение	Начальная цена продажи лота	Задаток (5%)
1	МАЗ 533702 280, 2005 г.в., г. Лида	69628800	3481440
2	Бульдозер Kamatsy D60E-6, 1996 г.в., г. Гродно	126263000	6313150
3	Кран МАЗ 5337 КС3577, 1992 г.в., г. Лида	63147300	3157365
4	Автомобиль МАЗ 53363, 2000 г.в., г. Лида	27377500	1368875
5	Экскаватор ЭО-3323, 1989 г.в., г. Лида	17326600	866330
6	Автобус ЛАЗ 695, 1992 г.в., г. Лида	26452600	1322630
7	Автобус ПАЗ 3205 40, 2004 г.в., г. Лида	50325900	2516295
8	Экскаватор-погрузчик New Holland, 2004 г.в., г. Гродно	191916000	9595800
9	Автомобиль МАЗ 53366, 1997 г.в., г. Лида	19613750	980688
10	Автомобиль Мерседес-Бенц 508Д, 1993 г.в., г. Гродно	66100000	3305000
11	Автомобиль Ситроен Ксантия, 1999 г.в., г. Лида	29953800	1497690
12	Полуприцеп для перевозки автомобилей OPELGGER 32, 1990 г.в., г. Гродно	60759000	3037950
13	Прицеп МАЗ 83781, 2001 г.в., г. Лида	11599750	579988

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене. Шаг торгов – 5%.

Торги состоятся 7 марта 2014 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127/5-411.

*До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: СООО «Эригал